**Л.А.Дзямешка,** *прафесар*
**Н.У.Клімянкова,** *дацэнт*
**С.А.Паўлава,** *дацэнт*

# ПАСЛУГІ БІБЛІЯТЭКІ Ў САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ: АДЛЮСТРАВАННЕ Ў ЦЫКЛЕ ДЫСЦЫПЛІН ПА АБСЛУГОЎВАННІ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ

Паслугі бібліятэкі ў сацыякультурнай сферы можна размежаваць на апасродкаваныя і неапасродкаваныя.

Апасродкаваныя паслугі ўключаюць інфармацыйныя рэсурсы з іх патэнцыяльна камунікацыйнай функцыяй; электронны каталог, каталогі-картатэкі, праблемна-арыентаваныя базы даных (у тым ліку бібліяграфічныя, рэфератыўныя, паўнатэкставыя БД на CD-ROM); наглядныя формы інфармавання (кніжныя выставы, адкрытыя прагляды літаратуры, бібліятэчныя плакаты і інш.).

Неапасродкаваныя паслугі прадастаўляюцца падчас стасункаў бібліятэчных супрацоўнікаў з карыстальнікамі, а таксама ў перыяд групавых і масавых мерапрыемстваў (прэзентацый, сустрэч, чытацкіх канферэнцый, круглых сталоў, вечарын).

Існуюць чатыры кірункі такіх паслуг:

– асабістыя кантакты бібліятэчнага персаналу з карыстальнікамі – індывідуальнае абслугоўванне, якое ў значнай частцы знаходзіць адлюстраванне ў курсе «Абслугоўванне чытачоў»;

– мерапрыемствы «паблік рылейшнз» (адлюстраваны ў курсе «Паблік рылейшнз»);

– рэклама (адлюстраваны ў спецкурсе «Бібліятэчная рэклама»);

– стварэнне ўтульнага бібліятэчнага асяроддзя (адлюстраваны ў курсе «Бібліятэчныя стасункі»).

У адпаведных дысцыплінах разглядаюцца пытанні развіцця гісторыі пэўных паслуг, методыка распрацоўкі і шляхі ўкаранення ў розныя сферы жыцця, іх эфектыўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У асноўным курсе «Абслугоўванне чытачоў» існуе раздзел «Формы і метады бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў». У межах раздзела студэнты вывучаюць тэорыю, методыку і практыку развіцця бібліятэчных стасункаў, формы і метады індывідуальнага абслугоўвання карыстальнікаў, самастойна распрацоўваюць мэтавыя дабрачынныя бібліятэчныя праграмы, знаёмяцца з бібліятэчнымі праектамі, засвойваюць методыку распрацоўкі і прадастаўлення грамадству групавых і франтальных формаў абслугоўвання.

Пры гэтым увага студэнтаў сканцэнтравана на злабадзённых праблемах сацыякультурнага жыцця грамадства, таму і практычныя заданні прадугледжваюць арганізацыю розных мерапрыемстваў, якія рыхтуюцца самастойна.

Індывідуальнае і калектыўнае засваенне культуры, аматарская і грамадская дзейнасць, стасункі, сустрэчы, адпачынак, спорт знаходзяць пэўнае адлюстраванне ў чытацкіх запытах. Вывучэнне запытаў чытачоў і іх ўлік у рабоце бібліятэкі (распрацоўка плана работы, зместу, кірункаў) – аснова спецкурса «Бібліятэка і вольны час».

У спецкурсе значная частка тэм прысвечана методыцы работы аматарскіх чытацкіх аб'яднанняў (клубаў па інтарэсах, гурткоў і інш.), а таксама правядзенню такіх мерапрыемстваў, як урокі міласэрнасці, дабрыні, мужнасці, вечарыны, вячоркі, прэс-канферэнцыі, літаратурныя вандроўкі і інш. Звяртаецца ўвага на асаблівасці рэжысуры бібліятэчных мерапрыемстваў і сцэнарную іх распрацоўку. Курс скіраваны на вывучэнне запытаў чытачоў у вольны час і іх забеспячэнне, на пашырэнне бібліятэчных паслуг у сацыякультурным жыцці насельніцтва рэгіёна.

Як вядома, мерапрыемствы «паблік рылейшнз» [ПР] прадугледжваюць стварэнне даверлівых і паважлівых адносін да бібліятэкі, прапаганду яе дзейнасці. Адпаведны курс накіраваны на вывучэнне інтарэсаў розных катэгорый насельніцтва. Асобныя тэмы прысвячаюцца характарыстыцы груп рэальных і патэнцыяльных чытачоў, лідэраў грамадскай думкі, кіруючых і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фінансавых органаў, сацыяльна не абароненых слаёў грамадства і інш. Удзяляецца ўвага методыцы распрацоўкі пэўных паслуг ў сацыякультурнай сферы. Студэнты знаёмяцца з выданнямі бібліятэк, аўдыёвізуальнымі матэрыяламі, публічнымі выступленнямі. На практычных занятках ім прапануецца авалодаць змешанымі метадамі здзяйснення ПР: распрацаваць праграму бібліятэчнага дня, месячніка, дэкады, экскурсіі па бібліятэцы, вернісажу, інакш кажучы, розных формаў камунікацыі бібліятэкі з грамадскасцю, якія маюць сваю дынаміку і валодаюць спецыфічнымі асаблівасцямі ўздзеяння.

Адным з кірункаў змешаных ПР з'яўляецца фандрэйзінг, які трактуецца як дзейнасць па паслядоўным прыцягненні новых сяброў бібліятэкі, інвестараў і партнёраў для здзяйснення яе сацыяльна значнай місіі. Студэнты знаёмяцца са стратэгіяй і тактыкай узаемаадносін, вучацца падачы бясспрэчных фактаў і лагічных аргументаў на карысць падтрымкі бібліятэкі. На лабараторных занятках ім прапануецца распрацаваць план фандрэйзінгавай дзейнасці бібліятэкі па наступнай схеме: пастаноўка задачы, аналіз знешняга і ўнутранага асяроддзя, ацэнка структуры будучых затрат, вызначэнне фінансавых патрэбнасцей, ідэнтыфікацыя патэнцыяльных донараў, выбар метадаў атрымання дапамогі (уздзеянне на донараў, канкрэтызацыя рэсурсаў і каналаў іх паступлення).

Сярод сацыякультурных паслуг бібліятэкі студэнты знаёмяцца з падрыхтоўкай пісем-зваротаў да патэнцыяльных мецэнатаў і спонсараў, распрацоўкай прэс-рэлізаў аб бібліятэчных акцыях, афармленнем галерэі дабрачынцаў і спонсараў і інш.

Сацыякультурная дзейнасць бібліятэкі шырока рэкламуецца ў грамадстве. Авалодаць тэорыяй, методыкай і практыкай рэкламавання бібліятэчных паслуг студэнты маюць магчымасць пры вывучэнні спецкурса «Бібліятэчная рэклама». Як вядома, асноўнымі функцыямі рэкламы з'яўляюцца фарміраванне попыту на бібліятэчныя паслугі і прадукты і папулярызацыя новых формаў і метадаў абслугоўвання карыстальнікаў. Праграма курса праду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гледжвае знаёмства з функцыямі рэкламы, методыкай распрацоўкі фірменнага стылю бібліятэкі, яе іміджу.

Што датычыць зместу сацыякультурных паслуг, прадуктаў, новых формаў і метадаў абслугоўвання карыстальнікаў, то гэтыя пытанні распрацоўваюцца студэнтамі ў рэкламных абвестках і прапануюцца бібліятэкарам-практыкам. Лепшыя з іх прымяняюцца ў рэкламнай дзейнасці бібліятэк.

У курсах «Канфлікталогія», «Чытачазнаўства», «Арганізацыя работы школьнай бібліятэкі», прысвечаных абслугоўванню карыстальнікаў, бібліятэчныя паслугі ў сацыякультурным развіцці грамадства таксама знаходзяць пэўнае адлюстраванне. Гэта садзейнічае ўмацаванню станоўчага іміджу бібліятэкі ў грамадстве і грамадскай свядомасці.

**Л.Ф.Жмачынская,** ***навуковы супрацоўнік БелДІПК***

## КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ МЕТАДЫЧНЫХ ЦЭНТРАЎ КРАІНЫ Ў СІСТЭМЕ РАСПРАЦОЎКІ І РЭАЛІЗАЦЫІ РЭГІЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

На працягу апошніх васьмі гадоў праведзены комплекс акцый па ўдасканальванні інфраструктуры культурнай палітыкі, у прыватнасці рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі» (1995), даследаванне па вывучэнні стану сеткі дзяржаўных устаноў культуры ў рэгіёнах краіны (1997), пашпартызацыя дзяржаўных клубных устаноў (1997), Першы фестываль народнага мастацтва Беларусі «Беларусь – мая песня» і рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Аматарская творчасць: устойлівыя і новыя тэндэнцыі» (1998), рэспубліканскі семінар кіраўнікоў органаў культуры «Новыя мадэлі ўстаноў культуры» (1999),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ